чыны гэтаму былі розныя. Па-першае, дрэннае эканамічнае забеспячэнне і становішча як манастыроу, так і краю ў цэлым. Па-другое, палітыка царскіх улад, скіраваная на скасаванне нацыянальных асаблівасцей і абмежаванне развіцця беларускай культуры.

Не было спрыяльных умоў для узнікнення і дзейнасці праваслаўных абіцеляў і ў XX ст. Толькі за апошнія дзесяць гадоў змяніліся адносіны грамадства і ўлады да царквы і рэлігіі ў цэлым. Так, на Беларусі, у прыватнасці ў Турава-Пінскім рэгіёне, пачалі аднаўляць сваю дзейнасць праваслаўныя манастыры: у 1992 г. – у Хойніках, у 1993 г. – у Пінску і у вёсцы Юравічы Калінкавіцкага раёна[8]. І трэба спадзявацца, што яны будуць не апошнімі ў Турава-Пінскім рэгіёне.

[1] Гл.: Мартос А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990. С. 69.

[2] Гл.: Сведкі беларускай мінуушчыны (зборнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі VI–XV стст.). Мн., 1996. С. 54.

[3] Гл.: Яскевіч А. Падзвіжнікі і іх святыні. Мн., 2001. С. 130.

[4] Гл.: Историко-статистическое описание Минской епархии, составленное ректором Минской духовной семинарии архимандритом Николаем. СПб., 1864; Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли. Вильно, 1867; Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн., 1848.

[5] Гл.: Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі. Мн., 2001. С. 294.

[6] Гл.: Чистович И. Очерк истории западно-русской церкви: В 2 ч. СПб., 1884. Ч. 2. С. 197.

[7] Гл.: Товаров А.В. Историко-статистическая справочная книга Минской епархии. Мн., 1903. С. 113.

[8] Гл.: Монастыри. Энциклопедический справочник. М., 2000. С. 267, 271–272.

***Алена Рыгораўна Дзянісава*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.

*Н.А. РОЦЬКА*

## ЗМЕНЫ Ў СТАНОВІШЧЫ ЧЫНОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ (60–90-я гг. XIX ст.)

У беларускіх выданнях XIX ст. слова «чыноўнік» азначала наступнае: «...той, хто меў які-небудзь чын на дзяржаўнай службе». Аднак у асобных творах другой паловы XIX ст., асабліва публіцыстычных, слова набывала больш выразны сэнс: «...чыноўнік – гэта дзяржаўны служачы, які абараняў інтарэсы цара і самаўладдзя»[1] (тут і далей – пераклад *Н. Р.*).

Па закону 1856 г., які з невялікімі дапаўненнямі існаваў да канца XIX ст., былі уведзены тэрміны руху чыноўнікаў па службовай лесвіцы. Прычым ніхто не мог быць павышаны цераз чын ці мінаючы ніжэйшыя чыны. Закон устанавіў рэгулятар – бездакорнае і пахвальнае выкананне сваіх абавязкаў, што было б пацверджана начальствам. Ужо з 1906 г. нават за выдатную службу нельга было прадстаўляць да чыну асобу, што праслужыла менш за дваццаць гадоў у класных чынах [2]. Пры прызначэнні на дзяржаўную службу прымаліся да ўвагі не толькі ўзрост (з 16 гадоў), адукацыя, але і паходжанне. Такое правіла існавала да 1906 г., калі ўсе саслоўі, нават падатныя, былі ўраўнаваны ў правах на дзяржаўную службу.

У другім артыкуле «Статута аб службе грамадзянскай» 1857 г. падкрэслівалася, што дзеці расійскіх падданых маюць права паступлення на грамадзянскую службу, калі яны ва ўзросце з 10 па 18 гадоў выхоўваліся пераважна ў айчынных грамадскіх установах. У адваротным выпадку яны пазбаўляліся права на займанне пасад у дзяржаўных установах[3]. Анкета для паступаючага на службу утрымлівала наступныя пытанні: прыналеж-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

насць да той ці іншай нацыянальнасці, веравызнання; з якога звання паходзіць; ці мае маёнтак сам, ці бацькі; ці падвяргауся спагнанням і пакаранням, звязаным з абмежаваннямі у перавагах па службе; ці быу у падазрэнні і г. д.[4] Для паступлення на дзяржауную службу патрабавалася падаць прашэнне на імя імператара. Загады на прызначэнне друкаваліся у «Дзяржауным Весніку», «Сенатарскіх Ведамасцях», «Губернскіх ведамасцях»[5] . Існавала правіла, па якому нельга было займаць адразу некалькі пасад у розных ведамствах, але строга гэта правіла выконвалася толькі у судовым ведамстве. На працягу службы на кожнага чыноуніка па месцы працы быу заведзены асобны паслужны спіс. Пры звальненні ў адстаўку служачы атрымліваў адпаведную атэстацыю.

У сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. існавала палажэнне «Аб парадку атрымання дваранства службай». Першы грамадзянскі чын калежскага рэгістратара даваў званне асабістага ганаровага грамадзяніна, такое ж – чын X і XII класаў. Чын IX класа (тытулярнага саветніка) даваў асабістае дваранства, так як і VIII, VII, IV класы. Чын V класа (стацкага саветніка) даваў права патомнага дваранства[6].

Змены ў палажэнні аб дваранстве пачаліся з 1856 г. і працягнуліся да канца XIX ст. Звязаны яны былі з Законам «Аб тэрмінах узвядзення у чыны па службе грамадзянскай». Аляксандр II разгледзеў прапанову большасці Дзяржаунага савета наконт узвядзення у чыны да V класа уключна, «але з тым, каб дваранства набывалася ў грамадзянскай службе толькі чынам сапраўднага стацкага саветніка, а на ваеннай службе – чынам палкоўніка»[7]. Ваеннаслужачыя таксама мелі іерархію чыноў і званняў. Яны атрымлівалі ганаровыя званні генерал-ад'ютанта, світы генерал-маёра, світы контр-адмірала. З кожным з гэтых ганаровых званняў была звязана магчымасць паскарэння руху ваеннай ці чыноўніцкай кар'еры.

Тытул чыноўніка залежаў ад класа і займаемай пасады, а таксама ад яго сацыяльнага паходжання. Чынам першых двух класаў надаваўся тытул «высокаправасхадзіцельства», трэцяга і чацвёртага – «правасхадзіцельства», пятага – «высакароддзе», шостага–восьмага – «высокаблагароддзе», дзевятага–чатырнаццатага – «благароддзе». Калі чыноўнік быў князем або графам, то да яго тытула дадаваўся тытул «сіяцельства», да тытула барона ці двараніна – «благароддзе», па асабліваму распараджэнню цара некаторыя князі атрымлівалі тытул «светласці»[8].

Новыя тэрміны для ўзвядзення у чыны устанаўліваліся ў 1856 г. «Пры паступленні асоб, што скончылі вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы, на грамадзянскую службу, яны зацвярджаюцца ў тым класным чыне, на які даюць права іх вучоная ступень, званне ці атэстат установы, у якой яны навучаліся»[9]. Для ўзвядзення ў наступны чын указваліся адзіныя тэрміны незалежна ад адукацыі і саслоўнай прыналежнасці. Пры гэтым захоўваліся два віды ўзвядзення – «за выслугу гадоў» і «за выдатную службу». Тэрміны ўзвядзення за выслугу ў класныя чыны назначаліся наступныя: тры гады (XIV кл.–XII кл., XII кл.–X кл., X–IX кл., IX кл.–VIII кл.); чатыры гады (VIII кл.–VII кл., VII кл.–VI кл., VI кл.–V кл.)[10]. Пры павышэнні «за выдатную службу» ўзгаданыя тэрміны скарачаліся на год. Як было запісана ў «Статуце аб службе грамадзянскай», узвядзенне заахвочвала паступленне на грамадзянскую службу асоб з вышэйшай адукацыяй. Выпускнікі універсітэта з вучонай ступенню кандыдата прымаліся на службу не ніжэй чына калежскага сакратара, гэта значыць станавіліся чыноўнікамі X класа; выпускнікі універсітэта са ступенню магістра прымаліся ў дзяржаўныя ўстановы чынам IX класа і пачыналі службу у званні тытулярнага саветніка. Спецыялісты са ступенню доктара атрымлівалі чын VIII класа – калежскага асэсара. Такім чынам, узровень адукацыі, зафіксаваны ў дыпломе, адрозненні ў поспехах вучобы з'яўляліся важным фактарам для вызначэння пачатковай ступені



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

службовай лесвіцы і далейшага руху па службе. Такі парадак дзейнічаў да узнікнення неабходнасці яго змянення у канцы XIX ст. Камісія для перагляду «Статута аб службе грамадзянскай» была створана ў 1895 г. пры Дзяржаўным савеце. Разам з пытаннямі чынаўзвядзення, руху па службовай лесвіцы, саслоўным цэнзе было разгледжана пытанне аб стане адукацыйнай падрыхтоўкі. Калі раней для паступлення на грамадзянскую службу было дастаткова скончыць павятовае вучылішча, то зараз па рашэнню камісіі быў устаноўлены мінімальны адукацыйны цэнз у аб'ёме шасці класаў сярэдняй вучэбнай установы. Паколькі павышэнне па службе здзяйснялася толькі пасля устаноўленай адпаведнай колькасці гадоў на кожнай пасадзе, важна адзначыць, што час знаходжання на класнай пасадзе быў пастаўлены ў залежнасць ад узроўню адукацыі, і калі асобам з вышэйшай адукацыяй дзеля атрымання пасады VII класа (надворнага саветніка) было дастаткова трох гадоў, то для чыноўніка з сярэдняй і ніжэйшай адукацыяй гэты тэрмін павялічваўся ў два, чатыры ці больш разоў. Такім чынам, службовы рост дзяржаўных чыноўнікаў быў пастаўлены ў залежнасць ад адукацыйнага узроўню.

Дадзеная сістэма выслугі гадоў праіснавала да 1917 г. Якім бы кампетэнтным і старанным ні быў чыноўнік, ён не мог заняць адпавядаючую свайму узроўню пасаду, не прайшоўшы лесвіцу чыноўніцкай іерархіі[11]. Табель аб рангах стаў анахранізмам, таму пытанне аб рэфармаванні узнікала у часы Аляксандра І, але ён не палічыў магчымым здзейсніць гэту рэформу.

Пытанне аб скасаванні чыноў зноў абмяркоўвалася у пачатку 80-х гг. Асобая нарада, створаная 28 кастрычніка 1883 г., прызнала неабходным скасаванне грамадзянскіх чыноў, так як «суадносіны паміж чынам і службовым становішчам асобы, яго носячай, зрабіліся зараз амаль выпадковымі і з-за гэтага чыны канчаткова страцілі ўсялякае значэнне»[12]. Аналіз, праведзены нарадай, паказаў, што розныя па чыну пасады займалі неаднолькавыя чыны. У выніку нарада прыняла рашэнне «замяніць існуючую сістэму грамадзянскіх чыноў асаблівай новай іерархіяй пасад, прадставіўшы прысвоеныя чынам правы і перавагі пасадам адпаведных ступеней»[13]. Прапаноўвалася адразу ж прыпыніць узвядзенне ў чыны асобна ад павышэння на пасадах. Рэкамендавалася «захаваць існуючыя чыны ў некаторых асоб да прызначэння на пасады вышэйшага ў параўнанні з цяперашнім іх чынам разраду»[14]. Гэта палажэнне, прапанаванае Асобай нарадай, было зацверджана Аляксандрам ІІІ 2 красавіка 1884 г., але яно разглядалася на працягу 1884–1885 гг. Нарада ўнесла пытанне аб скасаванні чыноў на разгляд Дзяржаўнага савета. Асобая нарада, атрымаўшы больш адмоўных водзываў, вымушана была адступіць ад прынятага рашэння і чыны не адмяняць.

Пытанне аб адмене чыноў набыло асаблівую вастрыню ў парэформенны перыяд, калі шэраг ведамстваў пачалі запаўняцца людзьмі, што пераходзілі з прыватнай службы на дзяржаўную, а як вынік – гэтыя асобы ці не мелі чыноў, ці знаходзіліся ў чынах, якія не адпавядалі займаемай імі пасадзе. Нягледзячы на неаднаразовыя абмеркаванні пытання аб адмене чыноў, яны праіснавалі да 1917 г.

Для ўпарадкавання функцыяніравання падраздзяленняў апарату нагляду за выкананнем указаў і распараджэнняў аб службе грамадзянскіх чыноўнікаў у ліку іх асабовага складу існаваў інспектарскі Дэпартамент, які займаўся прызначэннем на службу, узвядзеннем у чыны, звальненнем са службы, меў фармулярныя спісы ўсіх класных чыноў, што былі на дзяржаўнай службе. Дэпартамент канцэнтраваў у сваіх руках усе практычныя пытанні, звязаныя са службай чыноўнікаў. У яго абавязкі ўваходзіла складанне справаздач аб дзейнасці дзяржаўнай службы разам з дадзенымі аб колькасці



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

чыноўнікаў па класам і ведамствам, іх руху па службе, крыніцах даходаў. У другой палове XIX ст. ён то спыняў сваё існаванне, то аднаўляў зноў. З аднаго боку, урад быў зацікаўлены ў існаванні такога органа, які дазваляў трымаць пад кантролем дзяржаўную службу, але з іншага боку, такая жорсткая цэнзура ў кіраўніцтве чыноўніцкім апаратам рабіла машыну дзяржаўнай службы маларухомай. Яна адставала ад патрабаванняў усё больш удасканальваючагася дзяржаўнага ўпраўлення. Расійская бюракратыя была непаваротлівай, нязграбнай. Даследчыкі пісалі пра бюракратычны апарат таго часу: «...цяжка і думаць аб памяншэнні колькасці чыноўнікаў, дзейнасць якіх звернута не столькі на пошукі лепшых мер кіравання, колькі на лісанне, перапісванне, чытанне і падпісванне бумаг; пісьмаводства, што пашыралася да крайніх памераў, запавольвала усе справы і заблытвала рашэнне пытанняў, што патрабавалі хуткага рашэння»[15]. За службу чыноўнікі надзяляліся землямі да 1917 г. Атрымлівалася, што чыноўнік на Беларусі належаў да служылага класа, але па характару аплаты – да землеўласніцкай арыстакратыі.

Існавала сістэма заахвочвання службы чыноўніка з дапамогай узнагароджання за бездакорную службу. Калі ў дарэформенны перыяд дваранскае званне даваў любы расійскі ордэн, то ў другой палове XIX ст. (як аб гэтым гаворыцца ў Зводзе законаў выдання 1876 г.) гэта дасягалася толькі атрыманнем вышэйшых ступеней ордэнаў, за выключэннем двух: ордэна Уладзіміра IV ступені, які даваўся за 35-гадовую бездакорную службу, а ваенныя чыны ўзнагароджваліся ім за 25-гадовую службу. Але гэта магчымасць была моцна абмежавана: у жніўні 1887 г. быў выдадзены закон, па якому прадстаўленне да ордэна Уладзіміра IV ступені давала патомнае дваранства толькі тым асобам, якія праслужылі ў класных ці оберафіцэрскіх чынах не менш за 20 гадоў, а таксама былі ўзнагароджаны ордэнам Ганны, які атрымлівалі чыноўнікі, што мелі не ніжэй IV класа ў чыноўніцкай іерархіі[16].

З 1900 г. патомнае дваранства давала ўжо атрыманне ордэна Уладзіміра не IV, а III ступені, якімі ўзнагароджваліся чыны IV класа – сапраўдныя стацкія саветнікі.

Тым не менш бюракратычная сістэма была ахоплена карупцыяй і злоўжываннямі, нягледзячы на тое, што ў канцы XIX ст. губернатар атрымліваў прыкладна тры тысячы рублёў у год (для параўнання: міністр – прыкладна дванаццаць тысяч). Такім чынам, утрыманне вышэйшага эшалона чыноўнікаў каштавала ўладам прыкладна ў 30 разоў больш, чым канцылярскіх служачых[17].

Пачатак 60-х гг. XIX ст. характарызуецца выцясненнем патомных дваран чыноўнікамі, выхадцамі з непрывілеяваных саслоўяў. Гэта адбылося не толькі ў апараце кіравання цэнтральнымі губернямі Расіі, але і Беларусі пасля адмены прыгоннага права, калі краіна ступіла на шлях капіталістычнага развіцця. Чыноўніцтва ператварылася ў бессаслоўную сацыяльную групу капіталістычнага грамадства. Менавіта пасля адмены прыгоннага права дваранства Беларусі як класавае саслоўе размывалася і злівалася з рознымі слаямі буржуазнага грамадства. З малазямельнага і беззямельнага дваранства фарміраваліся кадры бюракратычнага апарату, інтэлігенцыі. У Беларусі гэта адбылося і па прычыне замены чыноўнікаў мясцовага паходжання выхадцамі з цэнтральных губерняў Расіі, бо сярод мясцовых чыноўнікаў было больш выхадцаў з дваранства.

Асноўная стаўка ўрада на Беларусі рабілася на ўмацаванне пазіцый бюракратычнага апарату рускага дваранства пры адначасовым аслабленні польскага. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. пачалася палітыка змяшчэння з пасад тых чыноўнікаў, у добранадзейнасці якіх урад сумняваўся.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Прадвадзіцеляў дваранства і міравых пасрэднікаў, што служылі па выбару дваранства, звальнялі, чыноўнікаў-каталікоў высялялі з краю. На іх месца запрашалі чыноўнікаў з цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. Польскае дваранства зноў пачалі прымаць на дзяржаўную службу толькі ў 70-я гг. XIX ст. Зварот да старых парадкаў адчувалі чыноўнікі польскага паходжання і асобы каталіцкага веравызнання ўжо пры Аляксандры III, калі ў першай палове 1880-х гг. зноў была праведзена чыстка мясцовых дзяржаўных устаноў ад чыноўнікаў-палякаў. Усе прадвадзіцелі дваранства польскага паходжання былі заменены на рускіх дваран да 1888 г.[18]

Існавалі і пэўныя абмежаванні, уведзеныя «Статутам аб службе грамадзянскай» 1857 г., для асоб яўрэйскай нацыянальнасці (гэта асабліва тычылася беларускіх губерняў, бо там пражывала іх вялікая колькасць). Яўрэі, што не мелі вышэйшай адукацыі, не дапускаліся на дзяржаўную службу, але на практыцы нават з вышэйшай адукацыяй яны, за рэдкім выключэннем, не маглі стаць чыноўнікамі[19]. У пункце аб праве паступлення на службу гаварылася толькі аб дзецях святароў праваслаўнага і грэка-уніяцкага веравызнання, а таксама аб дзецях евангельскіх і рэфарматарскіх пастыраў.

Такім чынам, на працягу 60–90-х гг. XIX ст. урад прадпрыняў шэраг мер для змен у становішчы чыноўніцтва, якія тычыліся павышэння іх адукацыйнага ўзроўню, тэрмінаў узвядзення ў чыны, рэгламентацыі парадку паступлення на службу. Менавіта дзякуючы гэтым мерам з'явілася магчымасць правядзення судовай, ваеннай і іншых рэформ на тэрыторыі Беларусі.

Разам з гэтым існавалі і адмоўныя тэндэнцыі, якія былі прадыктаваны унутрыпалітычнымі падзеямі таго часу – заменай мясцовых чыноўнікаў выхадцамі з цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. Давопі часта пасады займалі тыя расійскія чыноўнікі, якія або дрэнна зарэкамендавалі сябе на папярэднім месцы працы, або прыязджалі на Беларусь з мэтай атрымання прывілей і перавагаў. У выніку часта яны не вызначаліся добрымі маральнымі і службовымі якасцямі і, зразумела, не прыносілі карысці дзяржаўнай службе.

[1] Дабрыян М.В. Да ўжывання слоў «чыноўнік», «чын» у беларускіх выданнях XIX ст. // Пісьменнік, мова, стыль. Мн., 1996. С. 26.
[2] Гл.: Купель М. Табель о рангах военных, гражданских и придворных чинов Российской империи. Мн., 1995. С. 6.
[3] Гл.: Государственная служба в России: проблема становления: Сб. ст. М., 1993. С. 24.
[4] Гл.: Там жа. С. 28.
[5] Гл.: Энциклопедия Брокгауза и Эфрона: В 86 т. СПб., 1900. Т. 30. С. 440.
[6] Гл.: Государственная служба... С. 44.
[7] Там жа. С. 42.
[8] Купель М. Указ. тв. С. 6.
[9] Ерошкин Н.П. История государственных учреждений России. М., 1983. С. 218.
[10] Гл.: Там жа. С. 239.
[11] Гл.: Гомон-Голутвина О., Комаровский В. Польза не доказана, а вред возможен // Российская Федерация. 1999. № 1. С. 58.
[12] Дворжецкий-Богданович А. Воспоминания о Дене // Киевская старина. 1889. № 7. С. 275.
[13] Русский архив. 1885. № 12. С. 545.
[14] Зайончковский П.А. Правительственный аппарат самодержавной России в XIX веке. М., 1978. С. 45.
[15] Бобровский П.О. Материалы для географии и статистики, собранные офицерами Генерального штаба Гродненской губернии: В 2 ч. СПб., 1863. Ч. 2. С. 634.
[16] Гл.: Государственная служба... С. 38.
[17] Гл.: Гомон-Голутвина О., Комаровский В. Указ. тв. С. 62.
[18] Гл.: Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во в. п. XIX века. Мн., 1980. С. 18.
[19] Гл.: Энциклопедия... Указ. тв. С. 440.

*Ніна Аляксандраўна Роцька* – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Г. Каханоўскі.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm